Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта
намеснік Міністра адукацыі
____________________ Р.С. Сідарэнка

«12» сакавіка 2019 года

# ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXXV РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Магілёў, 2019 г.*

**10 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Варыянт I**

**Заданне 1.** Сёлета споўнілася 100 гадоў з дня ўтварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. На працягу першага дзесяцігоддзя існавання БССР яе ўрадам актыўна праводзілася палітыка беларусізацыі, вынікам якой стала ўвядзенне беларускай мовы ва ўсе найважнейшыя сферы грамадскага жыцця. Аднак менавіта ў гэты перыяд, дваццатыя гады XX стагоддзя, беларуская літаратурная мова ў шэрагу параметраў заўважна адрознівалася ад яе сучаснага нарматыўнага варыянта.

Для прыведзеных ніжэй слоў паспрабуйце аднавіць іх арфаграфічныя і фанетычныя асаблівасці ў адпаведнасці з тагачаснымі нормамі.

**Заўвага**: крытэрыем правільнасці адказаў з'яўляецца адпаведнасць напісанню слоў у наступнай крыніцы: *Некрашэвіч, С. Расійска-беларускі слоўнік / С. Некрашэвіч, М. Байкоў. – Менск: Беларус. дзярж. выд-ва, 1928. – 721 с.*

*Максімальная колькасць балаў – **4*** (0,5 бала – за кожны правільны адказ).

| | | | |
|---|---|---|---|
| мелодыя | | філасофія | |
| аркестр | | ззянне | |
| уніяцкі | | сімпатычны | |
| свяціла | | парыжскі | |

**Заданне 2.** Адной з задач у рэалізацыі палітыкі беларусізацыі ў дваццатыя гады XX стагоддзя была распрацоўка беларускай навуковай тэрміналогіі. Адметнасцю гэтага працэсу было імкненне распрацоўшчыкаў ствараць новыя словы на ўласным моўным матэрыяле. Першыя спробы ў гэтай справе аказалі значны ўплыў на развіццё беларускай кніжнай лексікі: шмат якія словы, што з'явіліся ў той час дзякуючы моватворчай дзейнасці вучоных-філолагаў і спецыялістаў у іншых галінах навукі, такія, як, напрыклад, *выкапень*,

*выслоўе*, *дужкі*, *працягласць*, ужываюцца і сёння. Аднак нямала іх засталося толькі ў сваім часе.

Паспрабуйце “вылічыць” значэнні прыведзеных ніжэй слоў, што ўвайшлі ў тэрміналагічныя зборнікі дваццатых гадоў XX стагоддзя, але не замацаваліся ў мове, і запішыце іх сучасныя адпаведнікі.

**Заўвага**: словы запісаны ў адпаведнасці з сучаснымі правіламі арфаграфіі.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| | |
|---|---|
| віхраслуп | |
| формаслоўе | |
| красленне | |
| смутнаглядны | |
| ускосіна (мат.) | |
| хістальнік | |

**Заданне 3.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Жары на острове, посреди воды, не бывает; по вечерам, когда затихал ветерок и от нагретой земли исходило теплое парение, такая наступала кругом благодать, такой покой и мир, так густо и свежо сияла перед глазами зелень, еще более приподнявшая, возвысившая над водой остров, с таким чистым, веселым перезвоном на камнях катилась Ангара и так все казалось прочным, вечным, что ни во что не верилось – ни в переезд, ни в затопление, ни в расставание *(По В. Распутину)*.

**Заданне 4.** Запішыце словы ў табліцу ў адпаведнасці з тым, у склад якой марфемы ўваходзяць гукі [*ц*] / [*ц'*]. Пры выкананні задання майце на ўвазе, што словы аналізуюцца ў прыведзенай граматычнай форме.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

**Словы для аналізу:** асаблівасці, выйсці, выкладчыца, гамоняць, касец, кахаць, кудысьці, куніца, моладзь, несяце, пацвердзіў, пенальці, покуць, поўсць, прамоўца, прысесці, стаць, сядзь, усміхаецеся, ходзіць.

| Корань | Словаўтваральны суфікс | Формаўтваральны суфікс | Канчатак | Постфікс |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

**Заданне 5.** Адной з граматычных цяжкасцей беларускай мовы з'яўляецца ўжыванне канчаткаў ***-а (-я)*** або ***-у (-ю)*** назоўнікаў мужчынскага роду 2 скланення ў форме роднага склону адзіночнага ліку.

1) Сфармулюйце найбольш агульнае правіла ўжывання гэтых канчаткаў.
2) Запішыце прыведзеныя назоўнікі ў адпаведны слупок табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**Словы для аналізу:** агарод, ансамбль, арыгінал, водаправод, ганак, граніт, дом, дагавор, жанр, інструмент, курс, малюнак, народ, плот, сезон, старт, талент, тэніс, флот, экіпаж.

**Агульнае правіла ўжывання канчаткаў *-а (-я)* / *-у (-ю)***

| Канчатак *-а (-я)* | Канчатак *-у (-ю)* | Канчатак *-а (-я)* або *-у (-ю)* у залежнасці ад значэння ў кантэксце |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

**Заданне 6.** Пастаўце ў сказах патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце і запішыце ў дужках колькасць сэнсава-граматычных частак у кожным з іх.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

1. Возера пакалыхвала свае хвалі і каб пачуць іх шум трэба было дужа ўважліва прыслухоўвацца да гамонкі дробных хваляў што срэбрам пераліваліся на сонцы. (__)
2. Яшчэ не хутка тыя дні калі пачне сеяцца дождж яшчэ стаіць цёплае сонечнае надвор'е але ўжо адчуваецца лес быццам насцярожыўся ў прадчуванні не такіх і далёкіх перамен. (__)
3. Здаецца ўсё па-летняму было і сонца шчыра грэла і луг у промнях зыркіх за сялом свяціў сваёй чупрынай парыжэлай. (__)
4. Каб стаць чалавекам у век наш суровы помні жыцця асновы гавары як вучыла маці рабі як вучыў бацька. (__)

**Заданне 7.** Аднавіце зашыфраваныя прыказкі і прымаўкі, у якіх пакінулі толькі зычныя літары.

Растлумачце значэнне ўстойлівых павучальных выслоўяў.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

**Узор**: ХЛБСМГЛВ – **Хлеб усяму галава** (*'Хлеб – самае галоўнае, найбольш важнае сярод іншага'*).

1. МРЦДМРЗЦЬПЛЦ – ________________________________________.
2. МЖНДВВРЖ – __________________________________________.

| № п/п | Значэнне прыказак і прымавак |
|---|---|
| 1. | |
| 2. | |

**Заданне 8.** Вызначце, для якіх мастацкіх напрамкаў характэрны прыведзеныя вобразы. Адказ запішыце ў табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

| *Мастацкія вобразы* | *Мастацкі напрамак* |
|---|---|
| Адзінокі герой, які ўцякае ад зручнага для іншых свету; адзінокі ветразь; Машэка і Наталька | |
| Тыповы чалавек у тыповых абставінах; Васіль Дзяцел; будаўнік завода; простая сялянская хата | |
| Горкія слёзы; сардэчны смутак; няшчасная дзяўчына; кошык з кветкамі; падманшчык пан | |
| Антычныя героі і вядомыя гістарычныя асобы; дзяржаўны чалавек; смешны селянін (толькі ў камедыях) | |

**Заданне 9.** Пры дапамозе «паэтычнай» даведкі ўзнавіце ўрывак з верша па першым радку. Запішыце назву і аўтара твора.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**Радкі для даведкі:**

Свае шырокія тканіны / А тут вецер дзьме горшы раз у раз, / Каб я хвілінны боль і горыч гэтай раны / Гадамі ў сэрцы заглушыць сваім не мог. / Палынны жаль смугой ахутаных дарог, / На лад персідскі ткуць яны. / Леціце жа вы без ратуначку!.. / Дзявочыя забыўшы сны, / Ні вуголчыка, ні прытулачку.

| | |
|---|---|
| **Урывак з верша** | *Пайшла, пакінуўшы мне золкі і туманны,* |
| | |
| | |
| | |
| **Аўтар верша** | |
| **Назва верша** | |

| | |
|---|---|
| **Урывак з верша** | *І цягам доўгія часіны,* |
| | |
| | |
| | |
| **Аўтар верша** | |
| **Назва верша** | |

| | |
|---|---|
| **Урывак з верша** | *Зямлі родненькай, знаць, няма у вас,* |
| | |
| | |
| | |
| **Аўтар верша** | |
| **Назва верша** | |

**Заданне 10.** Разгледзьце структуру ***сінквейна*** – японскай 5-радковай формы, якая (ужо без абавязковай рыфмы) стала выкарыстоўвацца ў ЗША для навучання творчаму мысленню. У прапанаваным ***сінквейне*** падкрэсліце фактычную памылку. Складзіце ўласны ***сінквейн*** па зададзенай тэме.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| ***Структура*** | ***Падкрэсліць памылку*** |
|---|---|
| 1. тэма; | *Паэзія Куляшова.* |
| 2. два прыметнікі, якія выражаюць галоўную думку; | *Праўдзівая, моцная.* |
| 3. тры дзеясловы, якія апісваюць дзеянне ў межах тэмы; | *Цэліць, пранізвае, абнаўляе.* |
| 4. чатыры словы (фраза, сказ), якія раскрываюць тэму; | *Расчытвае душу цэлага пакалення.* |
| 5. адзін назоўнік, які выражае асацыяцыі з тэмай | *Імпрэсіянізм.* |

| ***Уласны сінквейн*** |
|---|
| 1. Драматургія Крапівы. |
| 2. |
| 3. |
| 4. |
| 5. |